# Школьная планета

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА САВЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 6 (36) ЛЮТЫ 2017**

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці*




*“Не саромся, беларус, гаманіць па-свойму — на роднай мове бацькоў і дзядоў сваіх. Шануй сваю мову, шануй свае песні, свае казкі, звычаі і ўсё роднае — гэта спадчына дзядоў і вялікі нацыянальны скарб. Толькі тады цябе ўсе будуць шанаваць як чалавека, калі сам сябе будзеш шанаваць — калі не адкінеш свайго нацыянальнага ўласнага багацця. А першы скарб нацыянальны — гэта родная мова”.* ***Змітрок Бядуля***

21 лютага ў свеце адзначаецца **Міжнародны дзень роднай мовы**. Ён быў абвешчаны ЮНЕСКА. З прапановай увесці такі дзень выступіў Бангладэш, дзе 21 лютага 1957 года, адстойваючы правы вучыцца на роднай мове, загінулі пяць студэнтаў. Трэба адзначыць, што сярод 25 суаўтараў рэзалюцыі ЮНЕСКА аб гэтым свяце была і Беларусь.

Сёння ў нашым рознакаляровым і рознагалосым свеце налічваецца больш за шэсць тысяч моў. Палова з іх знаходзіцца пад пагрозай знікнення. Менавіта дзеля іх захавання і быў абвешчаны Дзень роднай мовы.

Гэта свята – нагода для носьбітаў любой мовы яшчэ раз задумацца аб лёсе той, адзінай, якую мы завём матчынай, на якой думаем, на якой вымавілі першае слова і на якой размаўлялі нашы продкі.

Няхай сёння родная мова моцная, распаўсюджаная, абароненая заканадаўствам, але няма гарантыі, што ўжо заўтра яна не трапіць у спіс тых трох тысяч, гатовых знікнуць.

Беларуская мова прайшла доўгі гістарычны шлях, на якім былі як часы росквіту, так і часы заняпаду. Былі нават такія перыяды, калі яна ледзь не знікла. Нашы бацькі, дзяды і прадзеды нямала зрабілі, каб беларуская мова была прызнаная як роўная сярод іншых моў свету.

Будзь жа разам з тымі, хто думае пра яе будучыню. Размаўляй па-беларуску, бо заўтра наша мова табе, тваім дзецям і ўнукам стане неабходнай. І не саромейся недасканалай гаворкі. Мова – жывая існасць, якая жыве там, дзе ёсць людское жаданне. Ведай: учора ты яшчэ не гаварыў па-беларуску, сёння размаўляеш на «трасянцы», а заўтра будзеш гаварыць на чыстай літаратурнай мове. А дзеля пачатку дастаткова зусім мала – проста паспрабаваць адзіны дзень у год, напрыклад, 21 лютага, з калегамі, сябрамі, роднымі, размаўляць па-беларуску.

***Матэрыял падрыхтавала Марыя Власюк***



# Вучань года. Які ён?

***Жыццё кожнага чалавека звязана са школай. Менавіта тут праходзіць дзяцінства, сталенне і станаўленне асобы кожнага, тут мы праводзім большую частку свайго часу; аднакласнікі, настаўнікі становяцца за школьныя гады дастаткова блізкімі нам людзьмі.***






Школа будзе нам у радасць, калі кожны *вучань будзе ветлівым, добразычлівым, выхаваным і разумным.* Гэта павінна быць абавязковым атрыбутам сучаснага школьніка. Бо як важна *ўмець весці гутарку, дарэчна адказваць, не перабіваючы суразмоўцаў*. Пераканана, што без такой якасці, як *камунікабельнасць*, нам цяжка будзе ўладкавацца ў жыцці. Я думаю, што сучасны вучань павінен *умець своечасова падтрымаць аднакласніка, не падняць на смех, калі ён разгубіўся*. Вядома, немагчыма, каб усе гэтыя якасці спалучаліся ў адным чалавеку. **Кожны чалавек індывідуальны і ў жыцці імкнецца дасягнуць сваіх мэт.** Няма падобных людзей з аднолькавымі думкамі, ідэямі, звычкамі, здольнасцямі. Усе мы розныя: спакойныя і запальчывыя, марудныя і энергічныя, добрыя і злыя. **Трэба ўмець мірыцца з чужымі недахопамі, успрымаць людзей такімі, якія яны ёсць. Бо не бывае ідэальных людзей.** Галоўная ўмова добрых адносін паміж людзьмі гучыць так: *рабі з іншымі так, як хочаш, каб паступалі з табой.* Бо кожнаму падабаецца, калі яго любяць, калі яму дапамагаюць.




**Галоўная задача любога вучня – вучыцца.** Шкада, што не ўсе школьнікі ўсведамляюць прыярытэт ведаў, такіх неабходных ім у будучым дарослым жыцці. У сучаснага школьніка шмат магчымасцей для самапазнання, самаразвіцця, самаўдасканалення. Галоўнае – захацець!!!

*Мы павінны навучыцца адкрываць сябе сабе.*
*І тады мы зможам стаць самадастатковымі людзьмі.*
*Бо менавіта такім, як мне здаецца, і павінен быць вучань года.*

***Матэрыял падрыхтавала Лізавета Вайцяховіч. Фота Ірыны Маркевіч***









**Міжведамсная прафілактычная *акцыя «Сябруем з Законам!»* стартавала з 5 лютага ў Мінскай вобласці. Мэтамі акцыі з'яўляюцца фарміраванне ў дзяцей і моладзі ўсвядомленых законапаслухмяных паводзінаў, прывіццё ім духоўных і маральных каштоўнасцей, імкнення да здаровага ладу жыцця.**

У рамках акцыі, якая завяршылася 25 лютага, былі праведзены спартыўныя і культурна-забаўляльныя мерапрыемствы па прававым выхаванні. Усе мерапрыемствы былі накіраваны на спыненне супрацьпраўных дзеянняў з боку падлеткаў, а таксама дарослых, якія ўцягваюць непаўналетніх у антыграмадскія паводзіны.

Ва ўстанове адукацыі ў гэтыя дні прайшлі пазакласныя гадзіны, лекцыі, віктарыны, круглыя сталы з дэманстрацыяй відэаролікаў. А ў судах, органах унутраных спраў, органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, аховы здароўя, рэлігійных арганізацыях адбыліся дні адкрытых дзвярэй для навучэнцаў.



**Экскурсія ў УЗ “Бярэзінская ЦРБ”**



**Сустрэча-дыялог з настаяцелем Храма Прыабражэння Гасподняга святаром Іаанам Шыбека**





**Экскурсія ў Бярэзінскі РАУС**



**Сустрэча-дыялог з участковым інспектарам інспекцыі па справах непаўналетніх Бярэзінскага РАУС Крывянковым А. В. у рамках прававога марафону «Падлетак і закон: вывучаем, ведаем, выконваем».**

***Матэрыял І.М. Бародзіч. Фота Ірыны Маркевіч***




**Валанцёрскія атрады БРСМ і БРПА наведваюць адзінокіх і адзінока пражываючых грамадзян пажылога ўзросту, ветэранаў вайны і працы, дапамагаюць ім у навядзенні парадку і прыбіранні дамоў і прысядзібных тэрыторый. Галоўная мэта акцыі — пераемнасць пакаленняў праз прыцягненне ўвагі моладзі да праблем людзей сталага ўзросту.**

**Добрых спраў шмат не бывае! Далучайцеся!**









***Аўтухова Яна. Фота Ірыны Маркевіч***

## ЛЮТЫ




Другі месяц года ў беларусаў з сівой даўніны называўся люты, ва ўкраінцаў — лютий, палякаў — luty.

У аснове назвы — прыродныя факты. Было заўважана, што менавіта гэты месяц з'яўляецца для чалавека самым складаным сярод іншых у гадавым цыкле. Па-першае, выпадала шмат снегу, стаялі лютыя (моцныя) маразы. І прыказка пра гэта напамінае: «Пытаецца люты, ці добра ногі абуты». Па-другое, як кажуць у народзе: «Гэты месяц не дае доўга спаць: трэба плугі ладзіць і калёсы папраўляць». Люты — «час звярыных вяселляў». Па-трэцяе (заўважана псіхолагамі) , люты — самы горшы час для якаснага сну і засынання: людзі марнуюць у сярэднім на 8 хвілін даўжэй, каб заснуць. Таму, напэўна, старажытныя насельнікі Зямлі і зрабілі яго самым кароткім (месяц мае 28 дзён у звычайны год і 29 — у высакосны).

На тэрыторыі Беларусі люты называлі яшчэ бліннікам. Відаць, па той прычыне, што гэтай парой святкавалі Масленіцу напярэдадні Вялікага паста з сытай абрадавай ежай — блінамі.



Слова люты ў беларускай мове можа быць і прыметнікам, які абазначае злую, крыважэрную жывёліну — люты воўк (руск. — свирепый, лютый); жорсткага, бязлітаснага чалавека — люты пан (руск. — жестокий, безжалостный); вельмі моцную ў сваім праяўленні з'яву прыроды — люты мароз (руск. — очень сильный, пагубный, холодный).

***Н.С. Міхалёва***

# Том і Джэры: гісторыя стварэння

**Том і Джэры - найпапулярнейшы маляваны амерыканскі мультсерыял пра мышаня Джэры і хатнягаката Тома. Створаны мульцік мульты-плікатарамі Уільямам Ханнам і Джозэфам Барбэрам. Першы выпуск мультфільма выйшаў на экраны 10 лютага 1940 года і называўся "Коцік атрымлівае пінка". Ката, дарэчы, спачатку звалі Джаспер.**




## *Гісторыя стварэння*

Гісторыя стварэння аднаго з самых папулярных мультыплікацыйных се-рыялаў XX стагоддзя пачалася яшчэ ў 1936 годзе, калі сцэнарыст Рыч Хоган прадставіў сваю гісторыю пра прыгоды ката і мышаня. Гісторыю бясконцых сварак, боек, смешных кпінаў і пагоняў.

Серыял "Том і Джэры" на розных этапах часу ствараўся рознымі студыямі і вытворцамі.

З 1940 па 1958-ы мультфільм ствараўся на студыі MGM (аж да яе закрыцця). Менавіта серыі гэтага перыяду былі прызнаныя самымі выбітнымі за ўсю гісторыю мультсерала. І як вынік - з'яўляюцца *уладальнікамі сямі узнагарод кінапрэміі Оскар.*

Значная *частка саўндтрэкаў да мультсерыяла створана кампазітарам Скотам Брэдлі*, без жывога і каларытнага музычнага суправаджэння серыял не стаў бы такім захапляльным і цікавым.

## *Сюжэт*

Сюжэт заснаваны на бясконцых спробах Тома злавіць Джэры, часам яны мірацца, нават дапамагаюць адзін аднаму, але потым зноў пачынаецца гульня ў кошкі-мышкі. Ідэя фільма зводзіцца да таго, што Том ніколі не зловіць Джэры, аднак у некаторых серыях Том перамагае.



*Пражыванне Тома і Джэры* ўвесь час мяняецца: то яны жывуць у чарнаскурай жанчыны, то ў стройнай белай жанчыны. Нязменна толькі тое, што яны жывуць пад адным дахам. У некалькіх серыях Тым жыве ва ўласным доме.

*22 сакавіка 2001 года памёр Уільям Ханна*. Джозэф Барбэра, тым не менш, прымаў актыўны ўдзел у стварэнні мультсерыялаў і кансультаваў мастакоў, як правільна маляваць такіх любімых усімі Тома і Джэры. Тады і была зроблена *поўнаметражка «Том і Джэры: Матор!»*


Уильям Ханна Джозеф Барбера

*У снежні 2006 года памёр і Джозэф Барбэра.* Але, нягледзячы ні на што, Том і Джэры, якія заваявалі сэрцы мільёнаў гледачоў па ўсім свеце, працягваюць жыць і з нязменным поспехам радаваць усіх аматараў мультфільмаў, прымушаючы іх залівацца смехам над вынаходлівымі трукамі і выхадкамі.

***Матэрыял падрыхтавала Дудко Аляксандра***

*Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях распрацавана канцэпцыя інфармацыйна-прапаган-дысцкай кампаніі* ***«Ганарымся, што навучылі»****, задача якой - матываваць бацькоў вучыць дзяцей правілам бяспекі. Чаму менавіта такая назва: «Ганарымся, што навучылі»? Ні для каго не сакрэт, што бацькі заўсёды любяць выхваляцца ведамі і ўменнямі сваіх дзяцей. Але здароўе, жыццё і бяспека дзіцяці – гэта самае галоўнае дасягненне. Распавесці сваім дзецям пра тое, як быць у складанай сітуацыі, аб тым, як пазбегнуць бяды, зрабіць так, каб дзіця ведала і заўсёды правільна паводзіла сябе, калі побач няма дарослых, – хіба гэта не падстава для гонару?*




*У рамках кампаніі ратавальнікамі распрацаваны матэрыялы для дзяцей і дарослых, відэа і аудыяролікі, наглядна-выяўленчая і сувенірная прадукцыя, вонкавая рэклама. Бацькі могуць пачаць простыя ўрокі бяспекі са сваімі дзецьмі цяпер, выкарыстоўваючы раздзел «МНС бацькам і педагогам»* ***на сайце 112.by****. Праверыць і замацаваць веды можна, прайшоўшы тэст для дзяцей і бацькоў, перайшоўшы па спасылцы* **http://mchs.gov.by/test/.** *Адказаўшы правільна на ўсе пытанні, Вы зможаце ганарыцца, што навучылі свайго дзіцяці. Звяртайце ўвагу на візуальную рэкламу, сачыце за ходам правядзення кампаніі на сайце МНС, а таксама ў СМІ.*

***Паважаныя бацькі! Давайце разам ганарыцца тым, што навучылі сваіх дзяцей правілам бяспекі!***

# ЛЮТАЎСКІ АБ'ЕКТЫЎ


































**23 марта 2017 года в 18.00**
**(актовый зал учреждения образования)**
**состоится общешкольное**
**родительское собрание**
**«Школа – микрорайон: традиции духовного воспитания гражданина и патриота Беларуси»**

**На базе**
**Государственного учреждения образования**
**"Средняя школа №2 г.Березино"**
смена "Денежная азбука"
в детском оздоровительном лагере с дневным пребыванием "Радуга" будет работать
с 27.03.2017 по 01.04.2017 года.

Оздоровительный лагерь
РАДУГА

**ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ**
**«МИНСКОЕ ОБЛАСТНОЕ КАДЕТСКОЕ УЧИЛИЩЕ»**

***приглашает на день открытых дверей***
***1 апреля 2017 года***

***В программе:***
***с 10.00 – экскурсии по училищу***
***с 11.00 – встреча с администрацией училища***

Белорусский государственный университет проводит
1 апреля 2017 года
День открытых дверей
«Фестиваль факультетов БГУ»,
который состоится по адресу:
ул. Ульяновская, 8
(здание лицея БГУ),
с 10.00 до 14.00.

БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

Учреждение образования
"Белорусский государственный технологический университет"
приглашает на
**День открытых дверей,**
**который состоится**
**19 марта 2017 г.**
**(начало в 12.00)**
по адресу г. Минск,
ул. Свердлова, 13-а.

аб'ява

ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына